СПАДЧЫНА

# Мова маёй зямлі

**Я настойліва варушу сваю памяць, вяртаю яе ў мінулае, да роднай, паляшуцкай мовы маіх продкаў.**

**(Працяг. Пачатак у № 4 ад 15.01.2022 года)**

*Выходылы тато з мамою за хліў, на огород посоветоватыса, шчо там за радоньку йому даты: зілле так і гоныть з зэмлі, кругом буяе, трэба косыты, та рано, батвінне картоплёвэ шчэ зэлёнэ, то хай побудэ шчэ крохы, холера його вэлыка не струбыть.*

А любую справу распачыналі-прыгаворвалі, асяняючы лоб трохперсцем, прасілі ў Бога блаславення:

*«Дай, Божэ, сылы до гэтое нывы».*

І сілай, сілай слова, трапнай прыказкай набываўся апорны, вядучы сэнс кожнай справе, прыходзілі мудрасць, роздум, памяркоўнасць:

*«Нэма чого на долечку роптаты, тэ ж хто тяжко носыть, той нэкого нэ просыть!».*

А ўсё ж такі прасілі! З сардэчнай просьбай на кожную патрэбу звярталіся да Госпада. Набывалі царкоўныя календары і імі карысталіся: выконвалі пасты, спраўлялі святы. Самым ушанаваным святам лічылі Вялікдзень. Рыхтаваліся да яго *загодя: шылы обноўкы, бэлылы сынькою стіны ў хаты, піч, мылы вокна, на Стругу носылы полокаты латы (бялізну), дэркачом шаровалы пудлогы до жоўтызны.* Узнёслы, радасны настрой панаваў у кожнай хаце.

*У Красну суботу хозяйкы красылы яйца ў цыбулныку, пэклы пырогы, пах пырогуў, подпраўленых чэрнушкою, апетытно плыў по сэлі, ажно ў носу козытало, малеча ўцягвала носам свяцейшы водар хлеба, затоена шэптала: «Ой, як смачно пахнэ, скорій бы його попробоваты!».*

Хлебам пахлі рукі гаспадынь.

*Шыховалыса до свята і мушчыны, у іх обовязкі ўходыло заколоты вэпрыка, осмалыты соломою, розобраты його. А потом ужэ задымваты, марыноваты свэжыну ну і, конэчно жэ, гнаты самогонку! Бражную обратку вылывалы на городы, а мы, діты, бэз помылок ўгадьвалы, хто ўжэ ўпраўляўся з такым ділом, бо бражка смэрділа на ўсэ сэло!*

Самай галоўнай урачыстасцю была падрыхтоўка да *Усюнучні. Той, хто нэ муг пойіхаты, пэрэдаваў нушэчкы, увязанэ святэ ў хусточку, і свэнчонэ було ў кожнуй хаты!*

І самы святы дзень на зямлі – Вялікдзень – сустракалі сінінцы надта ўрачыста. *Тато дожыдаў маму з роботы, готовыўса: хозяйство ўпраўлянэ, діты хорошэ поўбыраны ў пошытые обноўкы, да і сам як нэ ў новуй, то шчэ крохы ліпшуй рубашцы. На столі под тканым ручныком хаваўса пырог.* З'яўлялася мама, *надэвала святочнэ ўбранне, і тато становыўса кай покуття, нэспішно почынаў чытаты «Ойчэ наш», а мы ў гэты час вылупвалы голодны зікрачы на солодку скорынку пырога і марылы хучій йіі облызаты. Посля снідання з крашаными яйцамы збыралыся люды кай лаўкы (магазіна). Опронутые во ўсэ новэ, только і зналы, шчо охкалы і ахкалы, розглядваючы одна адну, бо булы ўсі нэшчасно хорошэ поўбыраны. Побыўшыса на яйца, совалы мужыкы іх у кышэню на закусь, хутко хавалыса за вугол лаўкы, доставалы з рукавуў чы з кышэнь пляшэчку. Котора жунка поспіе зловыты свойго хозяіна, як той заворачвае за вугол, наказвае: «Гляды ж, вэльмы нэ накоўтайса, бо шчэ ж на роботу трэба», алэ ў такы дэнь ныхто нэ сварыўса: жонкы самы за сніданнем прыгублялы гэту «муцну заразу»: А мы, шпэндрыкы сынынскые, пэрэкvасыўшы ўсі яйца, лычылы свуй прыбыток альбо страту, алэ особо нэ пэрэжывалы, бо тут жэ дэлылыса однэ з другым і разом іх йілы.*



Летам у вёсцы Сінін.

Свята збірала людзей да гурта, дарыла ім радасць, весялосць, адпачынак, адчуванне роднасці і еднасці.

І віталіся хораша: «*Здоровэнькы булы!*». А як падносілася чарачка госцю, ці з любой нагоды, гучала заўсёды: *«Дай, Божэ, у гэтуй хаты за год дождаты, добро нажываты да здоровым спожываты»*, адыходзячы казалі: *«доброноч добрым людям, муцно спаты і ляку нэ знаты».*

Вясковыя навіны разыходзіліся ўлёт: *усю нычэньку гыкалы тут пуд вокнамы ці: а вона стара вжэ, у дівках засэділаса, замуж нэ бэруть, мо то бракуўна ніяка?».*

На што *матэркы дэвок* адказвалі:

*«Тулькы ў школу діты по годам ходять, а замуж – колы бэруть!»* ці: *«І на йіі замужжэ дурань найдэцца».* Неўтаймаваныя бабулькі парыравалі: *«Жэныхоў пэрэбыраты – вік самуй віковаты».*

**(Працяг будзе)**

**Галіна ЛАЗЦКАЯ**